(г. Саранск, Республика Мордовия, 2009 г.), в продолжение выступления автора данной работы о сущности полемических жанров: можно ли выделить такую жанровую разновидность полемического текста, как полемическое эссе?

Руководствуясь вышеизложенными критериями определения жанра эссе (хотя некоторые исследователи говорят о том, что жанровые очертания эссе очень зыбкие), можно однозначно ответить на обозначенный вопрос: жанровая разновидность полемического эссе имеет все основания быть признанной в жанровой классификации полемических текстов, более того, в настоящее время она представляется жизнеспособной и востребованной как у публицистов, так и у читателей. У первых – в силу того, что таким образом можно говорить о многих проблемных, дискуссионных вопросах, не находя на них ответа в канве повествования, а лишь приглашая аудиторию к размышлению. Не случайно для жанра эссе характерна открытая концовка. У вторых – эссе популярно, благодаря создаваемому таким образом интерактивному по своей сути тексту (ведь есть возможность завязать дискуссию, ответить на выступление публициста), популярному в настоящее время. Причины видятся и в том, что нынешний читатель существенно отличается от того, каким он был в так называемый советский период: он привык к динамичному восприятию информации, «глыбы» текста его привлекают в меньшей степени, что воспитано нет-культурой – преимущественным восприятием информации из сети интернет. В связи с этим популярностью пользуются так называемые «экспресс-эссе», для которых не свойственна документальность, но очевидна реализация функции убеждения, подчас пропаганды, которая обнаруживается в литературной форме подобных материалов.

*Литература*


1. Мишель Монтень. Опыты. Избранные произведения: в 3-х томах. Том I. – 384 с. – Пер. с фр. – М.: Голос, 1992.



**Пётр Даращчонак**

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт


## Е.Р. РАМАНАЎ – РЭДАКТАР І ЖУРНАЛІСТ «МОГИЛЕВСКИХ ГУБЕРНСКИХ ВЕДОМОСТЕЙ» (90–я гг. ХІХ – пач. ХХ стст.)

Арганізацыя выхаду «губернских ведомостей» (1838 г.) у чатырох адміністрацыйных цэнтрах Беларусі (Віцебск, Гродна, Мінск і Магілёў) стала паваротным пунктам у шматвектарнай палітыцы

расійскай адміністрацыі ў буйным нацыянальным рэгіёне, якім з'яўляўся беларуска-літоўскі край. З'яўленне 175 гадоў таму ў беларускіх і літоўскіх губернях перыядычных выданняў на рускай мове абмяжоўвала ўплывы польскай культуры і каталіцкага касцёла, спрыяла пераводу мясцовых насельнікаў у сферу ўсходнееўрапейскай цывілізацыі і праваслаўнай царквы. Парэформенны перыяд, падчас якога зараджаліся і выспявалі ўмовы для фарміравання асноўных рысаў маладой беларускай нацыі і нацыянальнай ідэі, стаў часам актыўнай працы для збіральнікаў і даследчыкаў беларускай этнаграфіі, фальклору, якія назапашвалі і сістэматызавалі веды аб жыцці беларускага народа, яго багатай духоўнай спадчыне.

Сярод выдатных фалькларыстаў і этнографаў другой паловы XIX – пачатку XX стст. пачэснае месца займае Еўдакім Раманавіч Раманаў, які не толькі цесна супрацоўнічаў з большасцю выданняў ў губернскіх цэнтрах Беларусі, але і на працягу 1897–1903 гг. працаваў рэдактарам у газеце «Могилевские губернские ведомости». Ён з'яўляецца аўтарам больш за 200 навуковых прац па археалогіі, этнаграфіі, фалькларыстыцы, гісторыі, мова- і літаратуразнаўству, музеязнаўству. Галоўнай лініяй шматграннай дзейнасці яго як вучонага, літаратара, журналіста стала думка аб самабытнай нацыянальнай культуры беларускага народа, які мае права на самавызначэнне.

Е.Р. Раманаў нарадзіўся ў 1855 г. ў мястэчку Нова-Беліца (цяпер у межах Гомеля) тагачаснай Магілёўскай губерні ў мяшчанскай сям'і, якая па сваім матэрыяльным становішчы знаходзілася ў стане крайняй беднасці. Але маці ў 1867 г. змагла ўладкаваць здольнага падлетка ў Гомельскую прагімназію. Пасля яе смерці юнак закончыў гэту навучальную ўстанову ў 1870 г. толькі дзякуючы стыпендыі і прыватным урокам. Перайсці ў гімназію нават пры паспяховай здачы ўступных экзаменаў не атрымалася з-за нізкага сацыяльнага паходжання, няўдала закончылася і спроба стаць вольным слухачом ва ўніверсітэце. Займаўся самаадукацыяй, вытрымаў іспыт на званне народнага настаўніка і з 1872 г. пачаў працу ў Герасімаўскім народным вучылішчы Аршанскага павета. Праз год перайшоў у Бобрскае народнае вучылішча Сенненскага павета Магілёўскай губерніі, а з верасня 1874 г. настаўнічаў у Гомельскім павятовым вучылішчы.

Побыт беларускага народа быў вядомы Е.Р. Раманаву з дзяцінства, а яго сістэмнае даследаванне таленавіты самавучка пачаў у 1876 г., калі быў залічаны настаўнікам у штат Сенненскага па-

вятовага вучылішча. У Сянно ён яшчэ раз вярнуўся на пасаду выкладчыка рускай мовы і гісторыі ў 1884–1886 гг. пасля трох гадоў працы ў навучальных установах Гомеля і Ліды. У наступныя гады працаваў інспектарам народных вучылішчаў у Віцебскай, Гродзенскай і Магілёўскай губернях (1886–1906 гг.), пасля (у 1906–1916 гг.) займаўся справамі Віленскай публічнай бібліятэкі і музея.

Найбольш каштоўным у творчым і навуковым аспектах для Е.Р. Раманава стаў магілёўскі перыяд дзейнасці (1895–1906 гг.). Менавіта на Магілёўшчыне адбылося станаўленне Е.Р. Раманова як вучонага і грамадскага дзеяча. Гэтаму папярэднічалі першыя публікацыі ў друку, якія зрабілі яго імя вядомым расійскай навуковай грамадскасці. У першай палове 90-х гг. XIX ст. фальклорнаэтнаграфічныя публікацыі («Белорусский сборник», «Опыт белорусского народного снотолкователя», «Катрушницкий лемезень», «Очерк быта нищих Могилевской губернии и их условный язык») падрабязна прааналізаваў ў брашуры «Разбор этнографических трудов Е.Р. Романова» прафесар Харкаўскага ўніверсітэта М.Ф. Сумцоў (СПб., тип. Императорской Академии Наук, 1894 г.).

Гэта малавядомае для сучасных беларускіх навукоўцаў даследаванне ўтрымлівала нямала крытычных заўваг аб якасці сабраных твораў вуснай народнай паэзіі і іх сістэматызацыі. Аўтару, на думку прафесара, істотна перашкаджала «адсутнасць спецыяльнай філалагічнай школы» і незавершанасць гімназічнай адукацыі. Што да сабраных Раманавым беларускіх казак, то М.Ф. Сумцоў адшукаў там шмат новага і арыгінальнага. Асаблівасць беларускай народнай казкі ён бачыў не ў колькасці міфічных твораў на «шаблонныя» тэмы (барацьба з цмокамі і г. д.), а ў наяўнасці вялікага масіву гуманных легенд, у якіх сацыяльна-эканамічныя пытанні вырашаліся ў духу хрысціянскай любові і пакоры, што ўласціва менталітэту беларусаў. Адзначаў Сумцоў і якасны рост апошніх публікацый Е.Р. Раманава, якія прынеслі беларускай этнаграфіі «новыя этнаграфічныя факты» і істотна ўзбагацілі рускую навуку.

У свой «зорны» час – перыяд рэдактарства ў газеце «Могилевские губернские ведомости» (1897–1903 гг.) – Е.Р. Раманаў быў ужо вядомым у Расіі фалькларыстам, этнографам, археолагам, краязнаўцам. Санкт-Пецярбургская Імператарская Акадэмія Навук прысудзіла яму прэстыжную прэмію мітрапаліта Макарыя, яго працамі карысталіся не толькі вядомыя рускія даследчыкі (А.А. Патэбня, А.А. Весялоўскі, А.М. Пыпін), але і многія заходнееўрапейскія вучоныя. Пры актыўным удзеле Е.Р. Раманава на старонках «Могилевских губернских ведомостей» змяшчаліся публікацыі аўтараў

аб матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў з апісаннем жыллёвых пабудоў, народных абрадаў і інш.

З-пад пяра Е.Р. Раманава за гады яго знаходжання на пасадзе рэдактара неафіцыйнага аддзела «Могилевских губернских ведомостей» выйшла (у тым ліку пад псеўданімамі Е. Белицкий, Белорус, Радзіміч, Радимич, Е. Радимич, крыптонімамі Е.Р., Е.Р.Р., М.Р., Ъ, N) шмат уласных прац і даследаванняў, тры зборнікі «Могилевской старины» – першага перыядычнага навуковага выдання Магілеўшчыны. Асобнай кніжкай была надрукавана яго вялікая публікацыя «Материалы по исторической топографии Витебской губернии. Уезд Велижский» (Магілёў, 1898 г.). Расійскі чытач мог пазнаёміцца з брашурай Е.Р. Раманова «Катрушницкий лемезень. Условный язык дрибинских шаповалов» / Е.Р. Романов (Санкт-Петербург, тип. Императорской Академии Наук, 1901 г.). Им было выдадзена 9 тамоў «Белорусского сборника» (1886–1912 гг.) са шматлікімі фальклорна-этнаграфічнымі матэрыяламі, якія, складаючыся ў шырокую панараму побыту і культуры беларусаў дарэвалюцыйнага часу, зацвярджалі нацыянальную самабытнасць нашага народа.

Постаць Е.Р. Раманава займае ганаровае месца побач з такімі выдатнымі вучонымі, як Я.Ф. Карскі, М.Я. Нікіфароўскі, П.В. Шэйн, Б.І. Эпімах-Шыпіла, А.Я. Багдановіч і інш. Многія з іх супрацоўнічалі ў мясцовых рускамоўных перыядычных выданнях – «губернских ведомостях», якія на працягу амаль васьмі дзесяцігоддзяў (1838–1917 гг.) выходзілі на тэрыторыі Беларусі. Актыўны ўдзел Е.Р. Раманава, іншых бязмежна адданых справе беларускай гісторыі, этнаграфіі, краязнаўства, збірання фальклору вучоных, журналістаў, прадстаўнікоў нацыянальнай інтэлігенцыі дазволілі «губернскім ведамасцям» з іх вузкаскіраванай афіцыйнай праграмай настолькі пашырыць свой творчы дыяпазон, што пажаўцелыя старонкі выданняў у пэўным сэнсе сталі энцыклапедыяй парэформеннага жыцця грамадства ў другой палове XIX– пачатку XX стст., каштоўным матэрыялам для вывучэння матэрыяльных і духоўных здабыткаў беларускага народа.

*Літаратура*


1. Могилевский областной краеведческий музей им. Е.Р. Романова // Евдоким Романович Романов / [Электронный ресурс]. – Режим доступа: mogilewmuseum.iatp.by›romanov_er.html.
2. Пыпин, А. Н. История русской этнографии/ А.Н. Пыпин. – Мн. : БелЭн, 2005. – Т. 4 : Белоруссия и Сибирь . – 256 с.

3. Раманаў Еўдакім Раманавіч. Асветнікі зямлі беларускай: Энцыкл. даведнік / Рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.] – Мн.: БелЭн, 2001. – С. 348–349.
4. Раманаў Еўдакім. Беларускія пісьменнікі: Бібліягр. слоўн.: у 6 т. / Ін-т літ. імя Я. Купалы АН Беларусі; Беларус. Энцыкл.; Нацыянальны навукова-асветны цэнтр імя Ф. Скарыны // Пад рэд. А.В. Мальдзіса; рэдкал.: І.Э. Багдановіч [і інш.] – Мн.: БелЭн, 1995. – Т. 5. Пестрак – Сяўрук. – С. 142–146.
5. Сумцов, Н. Ф. Разбор этнографических трудов Е.Р. Романова / Н.Ф. Сумцов. – СПб.: Тип. Императорской академии наук, 1894. – 104 с.

**Ксения Дементьева**
*Мордовский государственный университет им. Н.П. Огарева (Россия)*

## МАССМЕДИА КАК ИНСТРУМЕНТ СОЗДАНИЯ КАРТИНЫ МИРА

Информация сейчас настолько разнообразна и противоречива, что один человек не может в ней самостоятельно разобраться. Поэтому подбор самой значимой информации и ее трансляция – ответственная задача всей медиасистемы, открывающая обширные возможности для воздействия на общественное мнение. Медиасистема – это совокупность всех видов опосредованной коммуникации, включающей прессу, радио, телевидение, интернет, рекламу и способной самоорганизовывать общественное мнение.

Массмедиа являются мощнейшим инструментом создания картины современного человеческого мира. Устройство обыденных знаний во многом определяется именно средствами массовой информации. Через прессу происходит познание событий реальности, которое порождает активность человеческих мыслей, вызывает предпосылки для уяснения теоретического мировидения и его фиксирования при помощи новых фактов. Массовая информация является дополнением непосредственного жизненного опыта людей.

Результатом журналистики является не просто производство текстов, в которых незамедлительно воссоздаются трансформации общества на разных уровнях – событийном и содержательном. В то же время журналистика выступает организатором содействия, сотворчества различных сил общества и отдельных людей для создания широкого информационного поля – неизбежного элемента в устройстве саморегулирования общества. Сейчас, когда качество технологий информации и их применение все больше предопреде-